# Выстаўка бібліятэчнай справы

У дні святкавання 30-годдзя рэспублікі ў Мінску адкрыецца рад выставак. Яны адлюструюць рост рэспублікі ў важнейшых галінах гаспадаркі і культуры.

Вось некалькі пасылак, якія прыбылі ўжо ў Мінск. Іх прыслалі з Мазыра, Гомеля, Гродна. Гэта экспанаты на выстаўку «30 год бібліятэчнай справы ў БССР». Выстаўка адлюструе дзейнасць бібліятэк Мінска, абласных і раённых цэнтраў, асобных сельскіх мясцовасцей. Гэта будзе самы шырокі паказ стану бібліятэчнай справы ў рэспубліцы.

Атрыманы цікавыя матэрыялы ад Гомельскай абласной бібліятэкі. Спецыяльны альбом прысвечан гісторыі бібліятэк вобласці і водгукам чытачоў на творы савецкай літаратуры.

Гомельская абласная бібліятэка пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачала сваю дзейнасць, маючы 500 кніг. Зараз тут налічваюцца дзесяткі тысяч кніг. Бібліятэка атрымлівае абавязковы экземпляр усёй кніжнай прадукцыі. У асобным пакоі захоўваюцца вельмі рэдкія арабскія рукапісы XV і XVI стагоддзяў, літаратура на замежных мовах і мовах народаў СССР.

Палеская абласная бібліятэка прыслала матэрыялы канферэнцый чытачоў, на якіх абмяркоўваліся лепшыя творы савецкіх пісьменнікаў. Такія-ж матэрыялы прыбылі з Гродна.

Вельмі шырока на выстаўцы будзе прадстаўлена дзейнасць Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна. Ідзе здбор матэрыялаў, якія характарызуюць работу гэтай буйнейшай культурнай установы рэспублікі.